А. Ф. Рогалеў

Назвы Бацькаўшчыны

(тапанімія Беларусі)

Гомель
Барк
2011

УДК 811.161.1'373.21(476)
ББК 81.2-3
Р59

Рэкамендавана да выдання кафедрай рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства установы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны"

Рогалеў, А. Ф.

Р59 Назвы Бацькаўшчыны (тапанімія Беларусі) / А. Ф. Рогалеў. 2-е выд. – Гомель : Барк, 2011. – 216 с.

ISBN 978-985-6763-72-7

У кнізе доктара філалагічных навук, прафесара А. Ф. Рогалева, які шмат гадоў вывучае тапанімію Беларусі, апавядаецца пра паходжанне назваў населеных пунктаў і водных аб'ектаў з розных раёнаў Беларусі. Аналіз геаграфічных імёнаў дае магчымасць рэканструяваць тыя старонкі мінулага, якія не адлюстраваны ў пісьмовых крыніцах. Прапануюцца таксама некаторыя цікавыя і малавядомыя гістарычныя факты. Навуковы падыход да выкладання матэрыялу спалучаецца з мастацка-публіцыстычным стылем, уласцівым аўтару, што робіць кнігу даступнай самаму шырокаму колу чытачоў.

УДК 811.161.1'373.21(476)
ББК 81.2-3

ISBN 978-985-6763-72-7

© Рогалеў А. Ф., 2011
© Афармленне.
ТДА "Барк", 2011

Змест

Новыя сцежкі ў даўніну 7
Амяльное, Падкаменне, Закружжа 10
Асвея, Асвейскае возера 14
Аўцюкі Вялікія і Малыя 17
Ашмяны 19
Балсуны 21
Бердыж 23
Брагін 25
Браслаўскія азёры 29
Бягомль 33
Валожын, Ваўкавыск 35
Ветка 40
Вішчын – летапісная Ваішчына? 44
Грабёнка, Грабнікі, Грабаўцы, Грабенікі, Грабаўка, Грабава, Грабаў, Грабск, Граб'ё 46

Дзякавічы 50
Днепр (Барысфен, Данапрыс, Славуціч) 53
Добруш 56
Доўск 58
Ельск 60
Жабінка, Шаркаўшчына 64
Жадунька, Жадынь, Жодзіна, Крупкі, Ушачы 67
Жамойск, Жомайдзь, Жамайдзякі, Жамайтукі, Жамойцішкі 68
Жыткавічы 70
Залатамін, Залатая Горка, Залатуха 72
Захарполле, Ганнаполле 75
Іванава, Моталь, Моладава, Дастоева 78
Калінкавічы, Ненач, Азарычы, Іпа, Іпуць 79
Капаткевічы 82
Карпілаўка, Рудабелка, Рудня, Акцябрскі і суседнія вёскі 84
Касцюковічы, Клімавічы, Асіповічы, Івацэвічы, Ганцавічы, Васілевічы, Мікашэвічы, Бешанковічы 94
Кімерыйскія сляды ў тапаніміі Беларусі 96
Клічаў, Клецк, Шчара, Чэрыкаў 99
Копысь, Смаргонь, Ясельда 102

Крывічы, Крыўчыцы, Крывое Сяло 105
Крычаў, Крычын, Крычына, Крычава, Крычавец, Крычнікі 107
Крэва 110
Лепель 111
Лёзна 113
Ліцвінавічы 116
Логнавічы 118
Лоеў, Чаплін, Каўпень, Мохаў, Страдубка 119
Лунінец, Лунін, Луні, Луніца, Лунна 123
Ляхавічы 125
Малейкі 128
Муціжар 129
Назвы рэчак – радкі са старажытнай гісторыі 131
Нарач, Сянно, Снопаць 141
Нароўля 144
Парычы 146
Перасяленцы-“нямкі”: паданні і гісторыя 147
Пра што сведчаць назвы балот 149
Рагачоў 159
Радзілавічы (Дзяржынск) 161

Ракаў 165

Расоны, Рось, Расава, Орша, Расоха 167

Ротань 169

Рудня-Каменева,
або чатыры назвы адной вёскі 171

Смалічы, Смалявічы, Смалёўшчына 174

Столінскія вёскі 175

Стоўбцы, Стаўпы,
Стаўбніца, Стаўбун, Стаўбуны 178

Сураў, Сураж, Сула, Каспля, Палата 181

Сцвіга, Моства 184

Талачын 186

Хатоўня, Хатынь, Хатуча, Хатовіж 187

Хлепен, Жлобін, Злобаўшчына 189

Хойнікі 193

Чавусы, Бася, Проня, Раста 194

Чарнобыль: легенда, назва, быль 196

Што такое Чорная Русь? 201

Шчучын, Целяханы, Лельчыцы 207

Пасляслоўе 211

Літаратура для аматараў тапанімікі 213

Новыя сцежкі ў даўніну

У 1992 годзе ў выдавецтве "Полымя" выйшла мая першая кніга – "Сцежкі ў даўніну. Геаграфічныя назвы Беларускага Палесся". У ёй абагульняліся мае тапанімічныя і краязнаўчыя даследаванні на працягу 80-х гадоў XX стагоддзя. Гэта былі самыя першыя "сцежкі", па якіх я пачаў своеасаблівае падарожжа ў прасторы і часе па зямлі Беларусі.

Мінулі гады, з'явіліся новыя кнігі, звязаныя з тапанімічным краязнаўствам. Мяне па-ранейшаму натхняе на пошук мой гістарычны сімвал – Гаміюк, пакладзены ў аснову назвы адной з лепшых маіх прац[1]. Гаміюк – гэта старажытная рэчка, якая ўпадала ў Сож на тэрыторыі сучаснага гомельскага парку. Ля вытокаў Гаміюка і Сожа ўзнік Гомель.

Яшчэ быўшы студэнтам, я паставіў перад сабой задачу знайсці вытокі Гаміюка – не ў літаральным, а ў пераносным, зразумела, сэнсе, гэта значыць рэканструяваць тое гомельскае мінулае, якое не зафіксавана ў пісьмовых помніках. Крок за крокам чвэрць стагоддзя я шукаў і апісваў старажытную мясцовую гісторыю і тапанімію, а разам з ёй і старажытнасці ў маштабах Гомельскай вобласці і нават усёй Беларусі. Пошукі

[1] Маецца на ўвазе кніга "От Гомиюка до Гомеля: Городская старина в фактах, именах, лицах", другое выданне якой выйшла ў гомельскім выдавецтве "Барк" у 2006 годзе.

і знаходкі паступова рэалізоўваліся не толькі ў шматлікіх артыкулах у абласным і рэспубліканскім друку, у кнігах, але і ў дзвюх дысертацыях – кандыдацкай і доктарскай.

Мяне заўсёды асабліва прываблівалі гісторыя, геаграфія і літаратура. Перапляценне гэтых навук ляжыць у аснове ўсіх маіх шматлікіх публікацый. Памятаю, як у дзіцячыя гады я часамі разглядаў геаграфічныя карты. На іх мяне цікавілі, перш за ўсё, назвы краін, гарадоў, азёраў і рэк. Гэтыя напісаныя на картах словы ўваходзілі ў маю свядомасць з усімі ўласцівымі ім фарбамі розных культур і моў. Яны ўжо тады літаральна гучалі для мяне той непаўторнай музыкай, у якой потым я пачаў чуць "ноты", пазначаныя часам.

Я імкнуся даносіць да людзей тое, чаго яны не знаходзяць нават у самых новых гістарычных энцыклапедыях. Мой аўтарскі прынцып – расказваць невядомае аб вядомым. Пры гэтым я проста раблю сваю прафесійную справу, даношу свае веды да людзей, імкнуся пісаць не толькі дакладна, але займальна і прыгожа, у чым знаходжу вялікую асалоду, перш за ўсё для самога сябе.

Мае кнігі – гэта маё самавыяўленне. Я не пераконваю нікога і ні ў чым, аднак арыентуюся на тых людзей, якія разумеюць, што мінулае цікавае не толькі неардынарнымі здарэннямі і знешне прывабнымі атрыбутамі, але і сваім зместам, сваёй сутнасцю, захаванасцю ў чалавечай памяці.

Няпроста шукаць усё новыя словы для ўступу. Ды і паўтараць ужо сказанае неяк няёмка. Звычайна я звяртаюся да некалі сказанага і напісанага тады, калі жадаю нешта адцяніць, падкрэсліць асабліва важнае, зрабіць пэўныя акцэнты ці калі знаходжу новыя факты, пра якія трэба абавязкова расказаць, бо яны дапаўняюць ці ўдакладняюць ранейшыя вывады.

У дадзеным выпадку скажу яшчэ раз тое, пра што пісаў у сваіх "Сцежках у даўніну". Геаграфічныя назвы (інакш – тапонімы, ад грэчаскіх слоў *τόπος* – "месца", "мясцовасць", "краіна", "вобласць", "прастора" + *όνομα, όνυμα* – "імя", "назва") агучваюць непаўторную мясцовую гісторыю. Яна не можа быць беднай ці багатай, цікавай або нецікавай. Трэба толькі прыгледзецца, пашукаць, знайсці і абавязкова захаваць.

Тапонімы часам гавораць там, дзе маўчаць усе іншыя крыніцы. Інфармацыя, здабытая з геаграфічных назваў, у некаторых выпадках можа быць нават лепшай і больш каштоўнай за гістарычную ці археалагічную інфармацыю.

Уласныя распрацоўкі ў галіне этналінгвістыкі, антрапанімікі, тапанімікі і тапаграфіі далі мне магчымасць упэўніцца ў тым, што ўвогуле ў сістэме ўласных імёнаў і, у прыватнасці, геаграфічных назваў, якія сканцэнтраваны ў той ці іншай мясцовасці, звычайна зашыфраваны тэкст – займальны расказ, які мае своеасаблівы і часам вельмі нечаканы сюжэт. У любым выпадку гэты сюжэт абавязкова ўражвае.

Калі чытач пагодзіцца з гэтым, ён абавязкова пачне чытаць кнігу і пройдзе разам з аўтарам па новых сцежках у даўніну.

Кніга складаецца з асобных нарысаў, кожны з якіх з'яўляецца самастойным апавяданнем пра тыя ці іншыя геаграфічныя назвы. Але ўсе нарысы аб'яднаныя адзінай тэмай, якая акрэсліваецца наступным чынам: тапанімія Беларусі ў гістарычным аспекце.

Амяльное, Падкаменне, Закружжа

Згаданых у загалоўку пасяленняў Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці ўжо няма. Чарнобыльскі смерч пакрыў гэты куток Бацькаўшчыны атамным попелам. Перапынілася гісторыя мясцовасці.

Што скажуць нашчадкі, калі знойдуць на старых картах гэтыя геаграфічныя імёны? Што пачуюць яны, калі запытаюцца пра мінулае некалі прыгожых і багатых населеных пунктаў?

Будзе вельмі прыкра, калі яны пачуюць адны толькі гукі памінальных званоў. Няхай жа не зарастаюць травой забыцця тыя факты, з дапамогай якіх мы склалі гэты нарыс.

Пра назву *Амяльное* расказваюць наступнае. На тым месцы, дзе існаваў пасёлак, было памесце князя Амелькі. Валодаў ён 500 гектарамі зямлі. Калі князь памёр, людзі сталі пераязджаць з вёскі Старое Закружжа на памесце, дзе і будаваліся. Так узнік пасёлак. А там, дзе быў пахаваны князь (яго быццам бы пахавалі ў склепе), пазней узніклі могілкі.

Пасёлак Амяльное ў дарэвалюцыйных статыстычных даведніках не пазначаны. Аднак можна меркаваць, што ён вырас побач з вёскай Старое Закружжа на месцы маёнтка, які належаў, згодна з даведнікам "Список населённых мест Могилёвской губернии" (Магілёў, 1910. С. 34), сапраўднаму стацкаму саветніку А. С. Далгову-Сабураву, праваслаўнаму, у распараджэнні якога, дарэчы, было 900 дзесяцін ворнай зямлі.

Назва *Амяльное* наўрад ці ўтворана ад імя *Амелька*. Думаецца, што наадварот, само імя легендарнага князя было матывавана назвай пасялення. Геаграфічнае ж найменне на самой справе звязана з абазначэннем расліны амялы, Uiskum album. Заўважым, што лес Амяльное ёсць побач з яшчэ адной былой веткаўскай вёскай, Барталамееўкай, а ў навакольлях выселенай вёскі Сівенкі існуе балота Амяльное. Гэтыя назвы таксама ўтворaны ад наймення расліны амялы.

Сяло Закружжа (гэта яго першапачатковая назва) па колькасці двароў у былой Вылеўскай воласці Гомельскага павета ўступала толькі сялу Добруш, цяперашняму гораду, раённаму цэнтру. У 80-я гады XIX стагоддзя ў Закружжы было 157 двароў, пражывала 1046 чалавек, меліся праваслаўная царква,

ветраны млын і броварны завод (Волости и важнейшие селения Европейской России. – Выпуск V. Губернии Литовской и Белорусской областей. СПб., 1886. С. 162). У 1910 годзе – 274 двары, 1872 жыхары (Список населённых мест Могилёвской губернии. С. 34).

Закружжа – гэта назва-арыенцір. Пры сваім узнікненні яна азначала "пасяленне, якое знаходзіцца за кругам". *Кругам* ва Усходнім Палессі называюць асобнае балота ці возера сярод лесу.

Са словам *круг* звязана і назва вёскі Кругоўка Добрушскага раёна Гомельскай вобласці, таксама "чарнобыльскага" пасялення. *Кругам*, відаць, здаўна называлі ў гэтай мясцовасці сапраўды круглаватае па форме возера Равучае, назва якога, па словах мясцовых старажылаў, пайшла ад таго, што "*па начах вада ў возеры шуміць, раве, громка плача*".

Такія "паводзіны" возера звязаны з так званымі карставымі з'явамі. Возера, як меркавалі географы яшчэ ў пачатку XX стагоддзя, мае падземную сувязь з бліжэйшай ракой Іпуць.

Ля самага Равучага возера знаходзіцца былая вёска Новае Закружжа, ці Марозаўка (Добрушскі раён). Дзве назвы гэтай вёскі пададзены ў статыстычным даведніку "Список населённых мест Могилёвской губернии". У 1910 годзе ў Марозаўцы было 97 двароў і пражывалі 529 жыхароў.

Пра назву *Закружжа* ў нас запісана наступнае паданне. Двое паляўнічых, якія пайшлі на паляванне, заблудзілі. Хадзілі-хадзілі яны, але ўсё па кругу, так і не змаглі выйсці з лесу. І тады пабудавалі яны сабе на гэтым "закружаным" месцы маленькую хацінку і сталі тут жыць. Так пачалася вёска Старое Закружжа. *Старым*, праўда, яно стала тады, калі ўзніклі выселкі з першапачатковага Закружжа – Новае Закружжа (Марозаўка).

Цікавае паданне ёсць у нашай картатэцы і пра паходжанне назвы пасёлка Падкаменне былога Старазакружскага сельсавета. Жыў стары дзед па імені *Ясь*. Быў ён вельмі скупы. Ляжаў на яго полі камень, які паступова рос і з кожным годам станавіўся ўсё большым. І вось вырашыў дзед пазбавіцца ад каменя і стаў капаць пад ім яму ў надзеі, што ён туды скоціцца. Але нядоўга капаў дзед, бо раптам зямля разам з каменем і дзедам правалілася, і трапіў дзед Ясь пад камень. Таму і пасёлак, які ўзнік тут, назвалі *Падкаменне*.

Гэты пасёлак, як і Амяльное, не згадваецца ў дарэвалюцыйных крыніцах. Думаецца, вырас ён з нейкай вартоўні на мяжы, якая раздзяляла землі розных гаспадароў. Нездарма ў паданні маецца матыў скупасці, прагнасці, хцівасці

У. І. Даль у "Толковом словаре живого великорусского языка" пры апісанні слова *камень* заўважыў наступнае: *"Слова, якое ператварылася ў назву многіх пагранічных урочышчаў, але першапачаткова, здаецца, яно азначала мяжу, граніцу, якую абазначалі каменем"*.

Паданне пра дзеда Яся можа ўскосна сведчыць пра даўнюю заселенасць гэтай тэрыторыі і нават пра нейкія археалагічныя старажытнасці ў наваколлях пасёлка Падкаменне. Фігура дзеда ў мясцовых паданнях, як правіла, з'яўляецца абагульненым вобразам продкаў. Камень жа мог быць не межавым знакам, а сапраўдным культавым аб'ектам. Нездарма і дзед, і камень праваліліся пад зямлю. Ці не з'яўляецца такая падрабязнасць ускосным сведчаннем заняпаду старых язычніцкіх вераванняў у дадзенай мясцовасці?

Пра пэўныя старажытнасці сведчыць і назва *Замкавае*, якая звязана з балотам, што існуе каля Старога Закружжа. Мясцовыя жыхары тлумачылі такое найменне тым, што вакол балота кальцом стаяў лес, які быццам бы "замыкаў" балота.

Аднак назвы тыпу *Замкавае* звычайна маюць археалагічны падтэкст, бо характэрныя для культурных пластоў позняга сярэднявечча. Праўда, такія назвы звязаны, як правіла, з узвышшамі, а не з балотамі. Можна думаць, што тапонім *Замкавае* быў утвораны таму, што побач з балотам у лесе знаходзіўся аб'ект, які і ўсведамляўся як Замак.

У Старым Закружжы было Народнае, ці Сялянскае возера. Назвалі яго так быццам бы таму, што выкапалі яго сяляне па загаду, як сцвярджаюць старажылы, "пана Паскевіча", без усялякіх прылад працы, рукамі. Капалі на месцы, дзе біла крыніца, таму вялікая яма і запоўнілася вадой. Спачатку возера называлася *Паскевіцкім*, а потым стала *Народным*, *Сялянскім*. Дарэвалюцыйныя даведнікі ўказваюць у Старым Закружжы сажалку. Відаць, гэта і было Сялянскае возера.

У возера, па мясцовай інфармацыі, упадаў ручай Оля. Ніякага імя панскай дачкі ў назве ручая, як меркавалі мясцовыя жыхары, не адлюстравана. Гідронім *Оля* суадносіцца з наступнымі

назвамі водных аб'ектаў: *Ала* (левы прыток Бярэзіны), *Ольніца* (рэчка ў басейне Прыпяці), *Ула* (левы прыток Заходняй Дзвіны, а таксама левы прыток Лузы на тэрыторыі Рэспублікі Комі), *Улянка* (правы прыток Сожа), *Улічка*, *Уліца* (рэчка ў басейне Дзясны), *Оленка* (правы прыток Дзясны), *Уленка*, *Уліна*, *Уланка*, *Улот*, *Алень* (басейн Акі).

Усе гэтыя назвы тлумачацца з дапамогай фіна-угорскіх геаграфічных тэрмінаў, сярод якіх: комі *уль* – "вільготны, мокры, сыры"; комі *ёль* – "лясны ручай", "рэчка"; мардоўскае слова *ёв* – "рака", "вада"; хантыйскае *ел* – "крыніца".

Узвышша паміж пасёлкам Амяльное і вёскай Марозаўка носіць метафарычную назву *Казіны Барадок*, якая звязана з формай аб'екта. Спачатку тут быў лес, потым яго высеклі. Каля пасёлка Падкаменне ёсць балота пад назвай *Журавіны*, на ім расце шмат ягад.

Каля пасёлка Амяльное кальсьці чарнеў балотны лес. Балота асушылі, лес спалілі, а ў апошні час на гэтым месцы ўжо апрацоўвалі зямлю пад палеткі. Называўся лес *Грэбелькай*. Відаць, раней тут праклалі грэблю – насып ці гаць з бярвён і галля.

За пасёлкам Амяльное была сенажаць, якая па форме нагадвала штаны. Таму яе так і назвалі – *Штаны*.

З Амяльнога на Ветку ішла Зімняя дарога. Яна была найбольш кароткай, але выкарыстоўвалася толькі зімой, магчыма, таму, што праходзіла па балоту.

На Ветку з вёскі Старое Закружжа і пасёлка Падкаменне ішла Францава дарога, названая па імені аб'ездчыка Франца, які жыў у лесе каля гэтай дарогі.

Адзначым яшчэ Панскі сад паміж Амяльным і Старым Закружжам і сажалку ("возера") Тапіла ля пасёлка Амяльное. Гэты вадаём быў утвораны з некалькіх копанак, у якіх купаліся і мачылі лён, а назвалі яго так таму, што быў ён вельмі глыбокім.

Напамінаюць аб былым поле Бакарэеўшчына каля Марозаўкі, сенажаць Пляханаўшчына за Старым Закружжам, Фёдараў бугор і Кулагін бугор паміж пасёлкамі Амяльное і Падкаменне.

Назвы гэтых аб'ектаў утвораны ад імёнаў мясцовых жыхароў розных часоў. У прыватнасці, сенажаць Пляханаўшчына з'яўлялася ўласнасцю купца, старавера П. Ф. Пляханава, гаспадара былога хутара Свісток.